уезда, обучался в иезуетской школе в Мстиславе. Окончив Витебскую академию, преподавал в пиарских училищах Лиды, Витебска и Щучина. С 1818 году он читал в Виленском университете лекции по логике, психологии и философии.

В творчестве А. Довгирда нашли воплощение идеи, и принципы умеренного крыла европейского Просвещения. Для А. Довгирда неприемлемы и чужды идеи радикальных французских просветителей, многие из которых стояли на позициях деизма или даже явного атеизма. Он целиком пребывает в рамках христианской традиции, и даже увлечение точными науками не выводит его за пределы этой традиции.

## *Анцыповіч М. В.* **Талерантнасць: метадалогія, варыянты азначэння**

Традыцыйнае разуменне талерантнасці падчас адштурхоўваецца ад глабальнага разумення праблем чалавецтва. Акрамя глабалізацыйнага ўзроўня аналіза талерантнасці сюды ж адносіцца супрацьпастаўленне яе ўсходняга і заходняга кірунку развіцця. Талерантнасць у сучасным свеце з'яўляецца адным з ключавых паняццяў палітычнай і сацыяльнай рыторыкі. Але адзінага меркавання з нагоды азначэння талерантнасці на сёняшні дзень не існуе. Талерантнасць трактуецца і як цярпімасць, і як паразуменне, і як замірэнне. А таксама дзесяткамі іншых спосабаў, кожны з якіх падбіраецца сітуацыйна, у залежнасці ад ключавой ідэі выступлення ці нейкага мерапрыемства.

Не толькі на побытавым узроўні, але і ў больш "вытанчаных" пластах грамадства ў адносінах да ўсвядамлення талерантнасці часта абмяжоўваюцца толькі палажэннем, што без выпрацоўкі ўзаемацярпімасці цывілізацыі, культуры, нацыі, сацыяльныя групы, асобныя людзі могуць проста знішчыць адно другога. І ўсё ж такая праблема талерантнасці куды больш складаная, чым яна падаецца на першы погляд. "Культываванне талерантнасці прадугледжвае не толькі існаванне, але і трывалую ўкарэненасць у грамадстве шэрагу установак, якія адносяцца да разумення чалавека і пазнання. У любым выпадку аўтарытарызм і патэрналізм (не гаворачы ўжо аб таталітарызме) выключна несумешчальны з ідэяй талерантнасці" [1, с. 47]. Талерантнасць у грамадствах рознага тыпу можа

праяўляцца больш ці менш фрагментарна, насіць выбарачны характар, таму дастаткова высокі ўзровень талерантнасці ў адной сферы грамадскага жыцця можа суседнічаць з праяўленнем неталерантнасці ў іншых. Напрыклад, гарантаваныя праваслаўным правы ў ВКЛ ( 16ст.) з'яўляліся пэўнай формай эканамічнага і судовага імунітэту царкоўнай арганізацыі. Уладанні і маёмасць Царквы ахоўваліся законамі, і ніхто не мог умешвацца ў царкоўныя справы. У гады княжэння Жыгімонта Старога ды ягонага сына Жыгімонта Аўгуста дзяржаўная рэлігійная палітыка паступова эвалюцыянавала ад стрыманай талеранцыі да свабоды веравызнанняў. У статуце ВКЛ 1529г. аднолькава падцвярджаліся правы і прывілеі як каталіцкага касцёла, так і праваслаўнай царквы. Прадстаўнікі непрывіліяванай канфесіі (некаталікі) карысталіся тут большымі свабодамі, чым у іншых краінах Еўропы [3. с. 32]. Першую значную хвалю рэлігійнай неталерантнасці ў Беларусі выклікала прыняццё Брасцейскай царкоўнай уніі 1596г. У дызунітаў (тых, хто не прыняў уніі) былі забраны храмы, шпіталі, школы, іх іерархію паставілі па – за законам. Кароль і вялікі князь Уладыслаў IV на пэўны час заспакоіў рэлігійны разлад, прыняўшы “Артыкулы Супакаення рэлігіі грэцкай”. Дзяржава вярнула праваслаўнай царкве рэлігійную свабоду, частку культавых пабудоў, прызнала законнай яе іерархію [3, с. 34].

Азначэнне тэрміна талерантнасць у паліталагічнай навуцы адрозніваецца ад сацыялагічнага, так як у адрозненні ад сацыялогіі, паліталогія асноўную ўвагу надае не сацыяльнай групе, а асобнаму актору, які надзелены палітычнай воляй і палітычнай матывацыяй. Станаўленне палітычнай талерантнасці ў грамадстве залежыць ад шэрагу фактараў: глабалізацыі, адраджэння нацыянальнай самасвядомасці, станаўленне рынкавых адносін. Высокая шчыльнасць актыўнага насельніцтва, якое ўцягваецца ў мноства сувязяў і кантактаў, у тым ліку сеткавага характара, робіць непазбежным узаемадзеяння людзей, нават тых, якія маюць вялікія разыходжанні паміж сабой. Людзі змушаны кантактаваць з тымі, хто ад іх прынцыпова адрозніваецца, і, як вынік, фармуецца змушаная, ці неабходная талерантнасць. Такая талерантнасць ўзнікае стыхійна, але арганізуецца, скіроўваецца, развіваецца дзяржавай і грамадствамю. Талерантнасць палітычнай культуры

выконвае функцыю зблiжэння, узаемапавагi i развiцця супрацоўнiцтва розных груп насельнiцтва.

Рэлiгiйная iнтэрпрэтацыя талерантнасцi мае два значэннi: 1) талерантнасць сама ўяўляе сабой грамадзянскую рэлiгiю, у межах якой фармуецца свае нарматыўнае (правiльнае) разуменне свету; 2) талерантнасць мае хрысцiянскiя каранi, у прыватнасцi, нарматыўнымi асновамi талерантнасцi выступаюць хрысцiянскiя дабрадзейнасцi ўседаравання i цярпення. Але дадзеныя дабрадзейнасцi маюць асобавасны змест, г. зн. гутарка вядзецца галоўным чынам не аб цярпiмасцi да чужых недахопаў, а аб неабходнасцi цярпець i дараваць у сiтуацыi, калi асобе дастаўляюць лiха. Для фiласофскiх канцэпцый, як i для рэлiгiйных дактрын, iдэя талерантнасцi суадносна па перавазе з цярпеннем, так як яно з'яўляецца адзiным iнструментам, якi дазваляе зберагчы суцэльнасць iдэйнай канцэпцыi. "З падыходаў сацыялагiчнай навукi талерантнасць можа быць азначана як цярпiмасць да адрозных ад звыклых укладаў жыцця, сiтуацыйных паводзiн, рэалiзацыi iншых традыцыйных i рэлiгiйных абрадаў [2, с. 29].

З спробаў комплекснай дэфiнiцыi вынiкае, што праблема талерантнасцi як светапоглядная была сфармулявана ў сувязi з праблемай верацярпiмасцi. Сучаснае прызнанне талерантнасцi фактарам умацаванння грамадзянскага мiра i сацыяльнай справядлiвасцi было шмат у чым вызначана навукоўцамi XVI – XVII ст., iх выступленнямi супраць рэлiгiйнага фанатызма. У розных варыянтах "талерантнасць" часцей за ўсё тлумачыцца як "цярпiмасць" – усталяванне i падтрыманне агульнасцi з людзьмi, якiя адрознiваюцца ў некаторых адносiнах ад пануючага тыпа цi не прытрымлiваюцца агульнапрынятых думак, прыняццё i сiмпатыя да думак другiх, якiя адрознiваюцца ад сваiх уласных.

Працэс здабыцця чалавекам ў раннiя перыяды сваёй гiсторыi розных ступеняў арганiзаванасцi выражаўся праз рэлiгiйнасць як адну з форм чалавечай свядомасцi. Для еўрапейскай традыцыi, пры ўсёй шматстайнасцi яе праяўленняў, мае вызначальнае значэнне суаднясення паганства i хрысцiянскай веры. Сiнтэз двух традыцый здзяйсняўся праз засваенне толькi тых палажэнняў паганства, якiя не супярэчылi вучэнню Хрыста, i, наадварот, нецярпiмасць да паганскай шматбожнасцi зрабiлася стратэгiчнай устаноўкай з боку хрысцiянства як сусветнай рэлiгii. Неталерантныя адносiны ў

сакральнай сферы ўзнікаюць з таго, што культура ўсіх традыцыйных грамадстваў насіла пансакральны характар, і таму адхіленне ад афіцыйнай рэлігіі было не толькі блюзнерствам, але адначасова дзяржаўным і сацыяльным злачынствам, якое закранала ўвесь існуючы светапарадак. Дактрынальная неталерантнасць паміж рознымі рэлігіямі ніколі не можа трансфармавацца ў талерантнасць, бо гэта прыводзіць да рэлігійна-светапоглядавай эклектыкі і пазарэлігійнай раўнадушнасці, а дыялог у дадзенай сферы можа насіць канфратацыйны характар, у якім бакі ўспрымаюць адзін другога як місіянерскі аб'ект. Трансфармацыя рэлігійнай неталерантнасці ў талерантнасць можа праяўляцца толькі на малекулярным узроўні асобных "Я", калі людзі шчыра прыхільныя ўласнай рэлігійнай традыцыі, паважаюць такога рода "крэпасць" у іншаверца. Па шэрагу пытанняў немагчыма прыйсці да агульнай думкі, у першую чаргу па рэлігійных поглядах, метафізічных сцвярджэннях, каштоўнасцях розных культур, этнічных вераваннях і перакананнях. Самаідэнтычнасць розных культур заснавана на тым, што яны нібыта не судакранаюцца паміж сабой. Як адзначаў В. Лектарскі: - "безумоўна, я можа і здольны засвоіць мову, звычкі, сістэму каштоўнасцей другой культуры ці засвоіць іншую пазнавальную парадыгму. Але важна падкрэсліць, што згодна дадзенаму разуменню, засвойваючы чужую сістэму каштоўнасцей ці парадыгму, я тым самым перастаю жыцьу сваёй сістэме каштоўнасцей" [1, с. 50].

Кожнае, у тым ліку самае экстравагантнае веравызнанне, якое дзейнічае ў рамках закона дзяржавы, мае поўнае права вызнаваць і пашыраць сваю веру, чым і сцвярджаюцца талерантныя адносіны паміж рэлігіяй і дзяржавай. Дзяржава, выступаючы як свецкая нерэлігійная інстанцыя, не парушае прынцыпа свабоды сумлення, калі выяўляе неаднолькавыя адносіны да розных веравызнавальных супольнасцяў, зыходзячы з паняцця "агульнага дабра".

Сусветны вопыт сведчыць аб тым, што ў сістэме дзяржаўна-канфесійных адносін дзяржава з'яўляецца самастойнай вядучай сілай, якая мае ў рэлігійнай сферы свае інтарэсы – маёмасныя, прававыя, ідэалагічныя, знешнепалітычныя. Пагэтаму дзяржаўныя інтарэсы могуць вызначаць дыферэнцыяльны падыход да розных канфесій.

Літаратура

1. Лекторский, В.А. О толерантности, плюрализме и критицизме / В.А. Лекторский // Вопросы философии. 1997, № 11, С. 46-54.

2. Медушевский, Н. А. Основы толерантности и правовой культуры / Н.А. Медушевский. – М., 2015.

3. Сагановіч, Г. Рэлігійная талеранцыя ў ВКЛ. // Матэрыялы па гісторыі Беларусі. - Мінск 1997. С. 30-35.

***Дроздович О. М., Головатая Е.*** **Нравственность как основа развития современных технологий**

*Разумное и нравственное всегда совпадают.*
*Л. Н. Толстой*

Современное общество все чаще ассоциируется с применением научно-технологических инноваций. Действительно, человек создал огромное количество техники, облегчающей и улучшающей жизнь. Но всегда ли развитие технологий - благо? Как выглядит нравственность глазами современного человека?

История развития техники и технологий - это история изобретений, так с XI по XVIII века были изобретены станки для промышленности, машины, часы, подводные лодки, пароходы и т.п. Пик изобретений приходится на XIX-XX века, когда были созданы фотоаппараты, видеофильмы, компьютер и ещё множество технических устройств. Первоначально не были значимы размеры и дизайн изобретаемой техники, важно было её функционирование. Позже человек задумался о форме и стиле того, что производит. Брэнд и реклама начали играть огромную роль в выборе того или иного технического средства современным человеком.

Современный век информационных технологий принес нам гигобайты информации. Сформировалась интернет-культура. Как глобальный феномен интернет-культура возникла благодаря Интернету и приобрела признаки обособленного общественного явления в рамках человеческой цивилизации. В понятие интернет-культуры могут входить самые разные аспекты. Интернет дал людям богатый инструментарий и возможность каждому выразить себя индивидуально в глобальном информационном пространстве.